Беларусь.info

№71 12/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**23 моладзевыя актывісты працягваюць галадоўку.** Галадоўка распачалася 15 дзён таму. Галадоўнікі, у асноўным сябры незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт”, патрабуюць спыніць крымінальныя справы супраць актывістаў сваёй арганізацыі, выключэньні з навучальных установаў за ўдзел у апазыцыйных акцыях, перасьлед вернікаў-хрысьціянаў, а таксама вызваліць усіх палітвязьняў. Непаўналетнія сябры “Маладога фронту” на просьбу кіраўніцтва арганізацыі ў акцыі пратэсту ня ўдзельнічаюць. Галадоўнікаў падтрымалі прадстаўнікі апазыцыйных партыяў, “Эўрапейскай кааліцыі”, а таксама замежныя моладзевыя партнэры маладафронтаўцаў.

**Найлепшыя кнігі забірае сабе прэзыдэнцкая бібліятэка.** Сёньня ў Доме літаратараў супрацоўнікі прэзыдэнцкай бібліятэкі пачалі забіраць найлепшыя кнігі з фонду Саюзу беларускіх пісьменьнікаў. Паводле кіраўніцтва творчай арганізацыі, даводзіцца саступіць частку свайго кнігазбору, бо судовыя выканаўцы патрабуюць на гэтым тыдні вызваліць памяшканьне.

**Рада Эўразьвязу асудзіла перасьлед праваабаронцаў.** Эўрапейскага зьвязу прыняла сёньня ў Люксэмбургу адмысловы дакумэнт, у якім асуджаецца перасьлед праваабаронцаў у розных краінах сьвету. Хаця непасрэдна ніводная з гэтых краінаў у дакумэнце ня згадваецца, неафіцыйна паведамляецца, што датычна суседзяў Эўразьвязу маецца на ўвазе перадусім Беларусь.

# Людзі

**Да галадоўкі "Маладога фронту" далучыўся дэпутат райсавету**. У Мастах таксама зьявіліся галадоўнікі. Сёньня да галадоўкі, распачатай салігорцамі, далучыўся дэпутат Мастоўскага райсавету Алесь Зарэмбюк. Алесь Зарэмбюк падтрымлівае ўсе патрабаваньні галадоўнікаў. Раней у Мастах да гэтай акцыі далучыліся Юрась Шлапік і Алесь Копаць.

# Цытаты

**А.Мілінкевіч: "Мы плянуем давесьці ўладу да крызісу раней, чым 2011 год.** Я абсалютна шчыра заўсёды кажу, што мы не гаворым пра выбары 2011, бо гэтыя даты ня маюць сёньня сэнсу на Беларусі. Ня будзе пры гэтай уладзе больш выбараў. Мы ведалі, што і прэзыдэнцкіх ня будзе – проста гэта для нас шанс на вялікую выдатную кампанію, тое самае мясцовыя выбары. Але мы плянуем давесьці ўладу да крызісу значна раней, чым 2011 год. І нават калі думаць пра 2011, на ім зноў нічога ня вырашыцца, калі ўлада будзе дзейнічаць гэтак сама – ня будзе выбараў".

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org